www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 8 верасня 2005 года, № 15 (1923)

## БДУ-NEWS

### «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» СТАЎ «УНІВЕРСІТЭТАМ»

З новага навучальнага года наша газета выходзіць пад назвай «Універсітэт». Старую назву «Беларускі універсітэт» мы змянілі, выконваючы Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 247 ад 31 мая 2005 г. «Аб дадатковых мерах па ўпарадкаванні выкарыстання слоў «нацыянальны» і «беларускі».

### НОВЫ ДЭКАН НА ГУМАНІТАРНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

*Самы малады факультэт БДУ — гуманітарны — атрымаў новага кіраўніка. Дэканам факультэта з 22 жніўня стаў кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, палкоўнік запасу Уладзімір Яўгенавіч ГУРСКІ.*

У 1975 г. У.Я. Гурскі закончыў Вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча (ВІЗРВ), атрымаўшы дыплом з адзнакай. Выкладчыцкай дзейнасцю займаецца з 1980 г. У 1995—2003 гг. (да звальнення ў запас з Узброеных Сілаў) Уладзімір Яўгенавіч быў загадчыкам кафедры электратэхнікі Ваеннай акадэміі. У 2003 г. быў абраны прафесарам гэтай кафедры, а па сумяшчальніцтве працаваў прафесарам кафедры інфармацыйнай тэхнікі і тэхналогій БНТУ.

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ

Матэрыял сакратара прыёмнай камісіі дацэнта А.І. Хмяльніцкага чытайце ў наступным нумары «Універсітэта».

## ДЗЕНЬ ВЕДАЎ

# "ВІВАТ, СТУДЭНТ!"

Сёлетні Дзень ведаў у вядучай ВНУ краіны быў адсвяткаваны не так, як заўсёды. Свята пачалося ў Мінскім кафедральным Свята-Духавым саборы, дзе адбыўся малебен, на якім прысутнічалі кіраўніцтва БДУ, выкладчыкі і, вядома ж, першакурснікі. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт выказаў свае меркаванні і развагі наконт ведаў, ісціны, свабоды.

Працягвалася свята ў Палацы спорту, дзе для першакурснікаў была арганізавана тэатралізаваная шоу-праграма "Віват, студэнт!" Сёлета універсітэт прыняў рэкордную колькасць першакурснікаў — каля 4000. Спецыяльна для іх і была падрыхтавана адмысловая святочная праграма, якая пачалася люмадынамічным шоу тэатра святла У. Кустова. Велізарныя палотнішчы, гульня святла, фігуры на хадулях — запамінальнае атрымалася відовішча. Працягнуў яго парад факультэтаў найстарэйшага універсітэта краіны — шэсце дэканаў і першакурснікаў: яны неслі 22 штандарты факультэтаў і падраздзяленняў БДУ. Музычнае афармленне забяспечваў рытм-гурт "Перкашн-класік".

Да новаспечаных студэнтаў звярнуўся рэктар БДУ прафесар В.І. Стражаў. У сваёй прамове ён пажадаў студэнтам універсітэта поспехаў.

Для прамаўлення традыцыйнай клятвы першакурснікаў БДУ на сцэну быў запрошаны Павел Белы, які яшчэ нядаўна быў абітурыентам, а сёння стаў студэнтам філалагічнага факультэта. Урачыстае "Клянемся!" за ім паўтаралі амаль 4 тысячы юнакоў і дзяўчат. Затым адбылося ўручэнне сімвалічнага студэнцкага білета, і харавая капэла праспявала "Gaudeamus".




Упраўленне па справах культуры БДУ падрыхтавала выступленні універсітэцкіх калектываў: вакальная група "Галант", узорны дзіцячы ансамбль "Літарынка", народны ансамбль танца "Крыжачок", фольк-медыя-група "Неруш" (вядомая далёка па-за межамі краіны). Сваё майстэрства паказалі і спартсмены універсітэта — найлепшыя каратысты. Таксама выступіла школа танца "Pops foundation" (яна, дарэчы, лічыцца найлепшай у краіне). Для першакурснікаў спявалі пераможцы фестывалю эстрады БДУ 2004 г.

Між іншым, першакурснікаў таксама вельмі актыўна запрашалі наведаць упраўленне па справах культуры. Магчыма, нехта з тых, хто яшчэ ўчора сядзеў на месцы гледача, у наступным годзе будзе віншаваць навічкоў са сцэны.

А гэтым разам першакурснікаў лепшай ВНУ краіны віншавалі і зоркі беларускай эстрады: Ларыса Грыбалёва, Гюнеш Абасава, Кірыл Слука, гурты "Эківокі", "Черника", "J-Mors" і інш.

Свята атрымалася цудоўным! Настрою на сур'ёзную вучобу першакурснікам павінна хапіць на цэлы год.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**



# Першыя хваляванні

***У жыцці першакурснікаў наступае цалкам новы перыяд — студэнцкія гады. З якім настроем, з якімі пачуццямі і эмоцыямі яны пачынаюць сваё навучанне ў сценах БДУ?***

**Аляксей, эканамічны факультэт:**

— БДУ — самая сур'ёзная ВНУ на Беларусі. Толькі яна можа даць грунтоўную падрыхтоўку для далейшай працоўнай дзейнасці ў Беларусі. Таму я сюды і вырашыў паступаць. Цяпер у мяне нейкае неадназначнае адчуванне: трошкі весела, але і трошкі страшна, нязвыкла. Новае месца, новыя выкладчыкі. А калі мяне не палюбяць?

**Ульяна, факультэт журналістыкі:**

— Я вельмі ганаруся, што апынулася сярод студэнтаў самай лепшай ВНУ рэспублікі. Але побач з радасцю існуе страх быць адлічанай пасля першай сесіі.

**Ганна, факультэт міжнародных адносін:**

— БДУ — вядучая ВНУ ў Беларусі. Мне вельмі пашанцавала, што я буду тут навучацца. Цяпер я знаходжуся ў чаканні: хто ведае, як усё складзецца.

**Кацярына, факультэт міжнародных адносін:**

— Я выбрала БДУ таму, што гэта самая прэстыжная ВНУ ў краіне. БДУ — гэта крута! Цяпер, калі ўсе цяжкасці іспытаў засталіся ў мінулым, я на сёмым небе ад шчасця!

**Анастасія ЮДЧЫЦ**
**Фота аўтара**

## Клятва першакурсніка

*Мы, першакурснікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, уступаючы ў шэрагі студэнцкага брацтва вядучай ВНУ краіны, урачыста клянемся:*

*прыняць эстафету годнага служэння айчыннай навуцы і культуры на карысць нашай дзяржаве;*

*не шкадуючы сіл, спасцігаць назапашаныя чалавецтвам веды;*

*высока несці, захоўваць і множыць слаўныя традыцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, ва ўсім быць узорам сумленнасці, высакароднасці і працаздольнасці і дысцыпліны, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім, навуковым і культурным жыцці роднай alma mater;*

*усю сілу розуму, увесь пал свайго сэрца накіраваць на павышэнне аўтарытэту айчыннай навукі і адукацыі;*

*з гонарам насіць гордае званне студэнта;*

*быць вартымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь —*

*Клянемся! Клянемся! Клянемся!*

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ЛЕКЦЫЯ ДЛЯ ЛІЦЭІСТАЎ

***Адкрыты ўрок на тэму «Я грамадзянін Рэспублікі Беларусь» для навучэнцаў ліцэя БДУ даў 1 верасня рэктар нашага універсітэта прафесар В.І. Стражаў.***

Ліцэісты даведаліся пра стан БДУ на сучасным этапе і перспектывы развіцця універсітэта. Рэктар адзначыў, што нашы ВНУ сёння захоўваюць усё найлепшае, што было ўласціва савецкай школе, і акумуліруюць перадавыя напрацоўкі сусветнай вышэйшай школы. Рэктар таксама адзначыў, что сучасныя школьнікі і студэнты павінны навучацца самі, але з дапамогай настаўнікаў і выкладчыкаў, а выкарыстанне найноўшых інфармацыйных тэхналогій дапаможа інтэнсіфікаваць навучальны працэс і ажыццяўляць кантроль за ходам атрымання ведаў. Васіль Іванавіч пажадаў поспехаў ліцэістам, большасць з якіх хутка стане студэнтамі БДУ.

**Юлія ПАПОВА**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ лазернай фізікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, інфарматыкі, вылічальнай матэматыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэхналогіі праграміравання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: крыніцазнаўства, англійскай мовы і моўнай камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРЫ англійскай мовы і моўнай камунікацыі.

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### РЭКТАРАТ ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя і гісторыі Царквы, біблеістыкі і царкоўнапрактычных дысцыплін, рэлігіязнаўства;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя і гісторыі Царквы (2), біблеістыкі і царкоўнапрактычных дысцыплін (1,75), рэлігіязнаўства (2).

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: багаслоўя і гісторыі Царквы (0,5), рэлігіязнаўства (0,5).

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біблеістыкі і царкоўнапрактычных дысцыплін (0,25).

**Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы, аддзел кадраў, тэл. 227-55-71.**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

### ЗАПРАШАЕ «ЛІТАРЫНКА»

Дзіцячы ўзорны ансамбль танца «Літарынка» (кіраўнік Канстанцін Зубік) упраўлення па справах культуры БДУ 18 верасня ў 10.00 праводзіць набор хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце 6—10 гадоў. Набор адбудзецца ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4).

**Кантактныя тэлефоны 209-54-69, 8-029-657-10-80.**

## ВІНШУЕМ!



# НАВАСЕЛЛЕ НА ЮРФАКУ




***6 паверхаў, 40 аўдыторый, самая вялікая аўдыторыя разлічана на 154 месцы. 360 тысяч кніг — найбагацейшы фонд юрыдычнай літаратуры ў рэспубліцы. Нарэшце, апошняя лічба — 31. Менавіта 31 жніўня адбылося ўрачыстае адкрыццё новага навучальнага корпуса юрыдычнага факультэта БДУ.***

Задоўга да азначаных 11 гадзін на пляцоўцы перад новым будынкам ужо сапраўдны натоўп. З дынамікаў гучаць музыка і спевы, на каго ні зірнеш — скрозь усмешкі на тварах, дзяўчаты ў народных касцюмах цярпліва трымаюць нажнічкі для традыцыйнай пунсовай стужкі і шчыра ўсміхаюцца фатографам. Злева ад уваходу ў запаветны будынак — сапраўдны кірмаш: падыходзь і купляй прадукцыю з лагатыпам юрыдычнага факультэта (ручкі, кубкі, майкі, сумкі, зашпэпкі на гальштук, біркулькі, ліхтарыкі). Пераезд адбыўся акурат у юбілейны для факультэта год — яму спаўняецца 80.

Адкрывае ўрачысты сход рэктар БДУ, прафесар Васіль Іванавіч Стражаў:

— Гэта свята не толькі універсітэта, але і свята горада, рэспублікі. Будаваць дэмакратычнае прававое грамадства нельга без падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

У сваёй прамове рэктар падкрэсліў, што прэзідэнт краіны ўзяў пад асабісты кантроль будаўніцтва новага корпуса.

Павіншавалі факультэт намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Н.У. Пяткевіч, намеснік старшыні Савета Рэспублікі А.М. Абрамовіч, старшыня Канстытуцыйнага суда Р.А. Васілевіч, старшыня Вярхоўнага суда В.А. Сукала, старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда В.С. Камянкоў, а таксама выпускнік юрфака 1978 г. міністр юстыцыі В.Р. Галаванаў, прадстаўнік генеральнага падрадчыка, генеральны дырэктар будтрэста № 7 Л.А. Левухненка. Менавіта гэты будтрэст будаваў і чыгуначны вакзал, што знаходзіцца непадалёку ад новага корпуса юрыдычнага факультэта.



Новы будынак асвяціў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, рэктар Інстытута тэалогіі БДУ.

Сімвалічны ключ ад новага корпуса ўручылі дэкану факультэта дацэнту, доктару юрыдычных навук Сяргею Аляксандравічу Балашэнку.

— Vivat, юрфак! Vivat, БДУ! — так пачаў ён сваю прамову. — Крыху болей за 20 год таму, калі я быў студэнтам I курса, намеснік дэкана М.Р. Пятачэнка сказаў на сходзе, што будынак факультэта не прыстасаваны для навучальнага працэсу і ў сувязі з гэтым у наступным годзе ці праз год пераедзем у новы будынак. Сёння яго прадказанне збылося! — тут раздаўся шчыры смех усіх запрошаных. — Я хачу падкрэсліць, што будаўніцтва новага навучальнага корпуса — гэта рашэнне кіраўніка дзяржавы і Савета міністраў, які поўнасцю ўзяў на сябе фінансаванне праекта (14 млрд рублёў).

Дэкан сказаў, што юрыдычны факультэт — унікальная прававая школа з вялікай гісторыяй: згадаў славуты трэці Статут ВКЛ, які больш за 200 год дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі, Прусіі, Фінляндыі, Літвы, Польшчы, часткова Украіны і Расіі. У яго напісанні прымалі ўдзел Леў Сапега, Яўстафій Валовіч і іншыя юрысты. Як вядома, гэта было сапраўднае наватарства на той час, бо ў Заходняй Еўропе выбарчая сістэма з'явілася на 100 год пазней. Выбітнасць факультэта заключаецца яшчэ і ў тым, што студэнты маюць магчымасць кантактаваць з вышэйшымі службовымі асобамі. Такім чынам, студэнты юрфака могуць пераймаць унікальны вопыт і нават апасродкавана ўплываць на заканадаўчую сістэму, працэс кіравання дзяржавай.



Пасля ўрачыстай прамовы дэкана адбылося традыцыйнае пераразанне пунсовай стужкі. Права адкрыць корпус было прадастаўлена рэктару і дэкану.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

*Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Няцяжка ўявіць сабе, наколькі складана прызвычаіцца да лекцый, семінараў, аўдыторый. Іншае жыццё, іншыя правілы. Нездарма кажуць, што самастойнае жыццё пачынаецца са студэнцкай лаўкі. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па універсітэце і яго структурах, які мы назвалі «Школа першакурсніка». З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем радыя вам дапамагчы.*

## БРСМ БДУ

Для моладзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй у свой час быў створаны «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У БРСМ БДУ студэнты могуць удзельнічаць у розных праектах, праграмах і акцыях. Працуе Студэнцкі цэнтр занятасці. Для тых, каго цікавіць сур'ёзная праца (другасная занятасць), праводзяцца праграмы «Кірмаш вакансій» і «Працоўнае лета»: у час летняга адпачынку штаб працоўных спраў прапануе прыняць удзел у будаўнічых, сельскагаспадарчых работах, педагагічных і валанцёрскіх атрадах. Сёлета нашыя студэнты дапамагалі на будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі, рэканструкцыі Аўгустоўскага канала, працавалі важатымі.

Студэнты БДУ ўдзельнічаюць у турзлётах, для іх ладзяцца падарожжы па Беларусі і краінах блізкага замежжа, паездкі ў экалагічныя, спартыўныя і творчыя лагеры.

Камітэт праводзіць дабрачынныя акцыі ў падтрымку дзіцячых дамоў «Мы разам» і «Радасць дзецям»: вы можаце падрыхтаваць ранішнікі для дзяцей. БРСМ ладзіць святкаванне Дня Маці, Дня сям'і, Дня сталых людзей, акцыі да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам.

Каманда КВЗ камітэта БРСМ БДУ «Пістоны» паспяхова выступае на агульнаўніверсітэцкіх і гарадскіх фестывалях гумару. Выдаецца малатыражная газета «Брызгі».

**Сакратар БРСМ БДУ — Аляксандр ЛЯНКЕВІЧ.**

**Чакаем усіх жадаючых рэалізаваць свае ідэі, планы і магчымасці (галоўны корпус БДУ, прасп. Незалежнасці, 4, каб. 205, тэл. 209-52-61).**

## ПЯРВІЧНАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ

Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ — адна з найстарэйшых: яна створана ў 1923 г. і налічвае больш за 10.000 членаў — гэта студэнты з 16 факультэтаў.

Галоўная мэта прафсаюза — абарона прафесійных, працоўных, сацыяльна-эканамічных правоў і законных інтарэсаў сваіх членаў.

Прафкам студэнтаў вядзе працу па сямі кірунках: арганізацыйна-масавым, сацыяльным, жыллёва-бытавым, вучэбна-вытворчым, спартыўна-аздараўленчым, культурна-выхаваўчым, па ахове працы.

Прафсаюзная арганізацыя кантралюе санітарна-гігіенічны стан інтэрнатаў БДУ, праводзіць мерапрыемствы па паляпшэнні жыллёвых умоваў, займаецца засяленнем студэнтаў, якія маюць сацыяльныя льготы, хадайнічае пра выдзяленне месцаў у інтэрнатах для студэнтаў-інвалідаў і дае магчымасць пражываць там улетку. Жыллёва-бытавая камісія займаецца вырашэннем канфліктаў паміж студэнтамі і адміністрацыяй інтэрната.

Прафсаюз студэнтаў адсочвае факты парушэння заканадаўчай базы, якія тычацца сацыяльнай сферы, вядзе ўлік студэнтаў розных сацыяльных груп, якія знаходзяцца на стацыянарным навучанні, арганізоўвае санаторна-курортнае лячэнне студэнтаў, ладзіць унутрыуніверсітэцкія спартыўна-аздараўленчыя мерапрыемствы, кантралюе работу бібліятэк.

Яшчэ адзін напрамак дзейнасці — арганізацыя юрыдычных кансультацый па пытаннях размеркавання і працаўладкавання, кантроль за размеркаваннем вучэбнай нагрузкі.

Вучэбна-вытворчая камісія адсочвае перамяшчэнне студэнтаў па універсітэце і на факультэтах (пераход з аднаго факультэта на другі, перавод на завочную форму навучання, з бюджэтнай — на платную і наадварот, сыход у акадэмічны адпачынак, змена прозвішча, адлічэнне і аднаўленне).

Культурна-выхаваўчая камісія арганізоўвае штогадовыя святы БДУ: Ноч закаханых, Ноч смеху, Новы год. Яна ж удзельнічае ў пасяджэннях універсітэцкага клуба «Студэнцкая сям'я XX стагоддзя», займаецца закупкай і распаўсюдам па ільготных цэнах ці бясплатна квіткоў на дыскатэкі, у тэатры, на КВЗ і іншыя забаўляльныя мерапрыемствы.

**Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ — Ніна Міхайлаўна РАДЗЕВІЧ.**

**Адрас: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 201, 203, тэл. 206-62-33, 226-59-57.**

## ПАХОД У БАНК

***Студэнты і платнай, і бюджэтнай формаў навучання з цягам часу маюць пэўныя фінансавыя справы з універсітэтам: нехта плаціць сам, нехта атрымлівае стыпендыю і грашовыя прэміі. Усе гэтыя аперацыі праводзяцца з дапамогай банка.***

Абслугоўваючым банкам БДУ з'яўляецца МГД ААТ "Белінвестбанк". Як расказала начальнік аперацыйна-касавага сектара № 1 Людміла Руткоўская, аплата навучання, пражывання ў інтэрнаце, а таксама камунальных паслуг, прыём грошай за дакументы і выдача стыпендый — гэта асноўныя спецыялізаваныя для студэнтаў віды дзейнасці банка. Многія таксама карыстаюцца банкам для аплаты паслуг мабільнай сувязі.

Па словах Людмілы Іванаўны, аплата навучання, пражывання ў інтэрнаце і прыём грошай за дакументы адбываецца ў 14 філіялах "Белінвестбанка", але толькі ў беларускіх рублях. Праўда, большасць студэнтаў чамусьці стараецца аформіць гэтыя здзелкі ў банку на Бабруйскай, 9, марнуючы час у даўжэзнай чарзе. А ў іншых філіялах касіры не могуць дачакацца кліентаў.

Самая прыемная для студэнта банкаўская аперацыя — безумоўна, атрыманне стыпендыі. Яна выдаецца кожны месяц пасля 20-га, згодна з графікам для кожнага факультэта па выніках папярэдняй сесіі. У ліпені студэнты атрымліваюць грошы за бягучы месяц, а таксама за жнівень. Стыпендыю можна атрымоўваць як у самім банку (у філіяле на Кастрычніцкай, 10), так і з дапамогай пластыкавай карткі. Як паведаміла Людміла Іванаўна, з моманту афармлення заявы на атрыманне карткі да часу яе выдачы звычайна праходзіць каля 2—3 тыдняў. Але ў часы вялікага наплыву заяў ад студэнтаў гэты тэрмін можа павялічыцца. Атрыманне грошай па картках лічыцца перспектыўным, таму зараз вядзецца праца, каб у будучыні першакурснікі, якія маюць права на стыпендыю, з першых дзён навучання атрымоўвалі крэдыткі.

Акрамя гэтага, студэнты маюць магчымасць адкрыць у "Белінвестбанку" свой дэпазіт і зарабляць такім чынам да 14 % гадавых. Але, як кажа Людміла Руткоўская, на такое адважыцца рэдкі студэнт — ім заўсёды патрэбны наяўныя сродкі.

**Аляксандр САЛАМАХІН**



### Аплату за навучанне, інтэрнат, дакументы, а таксама іншыя плацяжы на адрас БДУ можна рабіць у аддзяленнях ААТ «Белінвестбанк»:

**Мінская гарадская дырэкцыя ААТ «Белінвестбанк»:** вул. Калектарная, 11 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 16.00 (пятніца да 15.30). Выхадны — субота, нядзеля.

**ЦБУ (ОКС):** вул. Бабруйская, 9 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 16.45 (пятніца, субота да 15.30). Выхадны — нядзеля.

**ОКС № 2:** вул. Кастрычніцкая, 10 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 17.00 (пятніца да 16.15). Выхадны — субота, нядзеля.

**ОКС № 1:** прасп. Дзяржынскага, 3 (будынак ДАІ) — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 17.00 (пятніца да 16.00). Выхадны — нядзеля, панядзелак.

**РКЦ № 1:** вул. Ясеніна, 76 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 17.00. Выхадны — нядзеля, панядзелак.

**Аддзяленне «Сталічнае» ААТ «Белінвестбанк»:** вул. Леніна, 16 — з 9.00 да 13.00, з 14.00 да 15.00 (пятніца да 13.00). Выхадны — субота, нядзеля.

**ЦБУ:** вул. Варвашэні, 16 — з 9.00 да 13.00, з 14.00 да 16.00 (пятніца да 15.00). Выхадны — субота, нядзеля.

**Аддзяленне «Заходняе» ААТ «Белінвестбанк»:** вул. Адзінцова, 69 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 15.00. Выхадны — субота, нядзеля.

**Аддзяленне «Цэнтральнае» ААТ «Белінвестбанк»:** пл. Свабоды, 17 — з 9.00 да 13.00, з 14.00 да 15.00. Выхадны — субота, нядзеля.

**ЦБУ:** вул. Акадэмічная, 20 — з 9.00 да 13.00. Выхадны — субота, нядзеля.

**Аддзяленне «Славянскае» ААТ «Белінвестбанк»:** прасп. Незалежнасці, 77 — з 9.00 да 12.45, з 13.30 да 16.00 (пятніца да 15.00). Выхадны — субота, нядзеля.

**Аддзяленне «Купалаўскае» ААТ «Белінвестбанк»:** вул. Інтэрнацыянальная, 25 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 16.00 (пятніца да 13.00).

**Аддзяленне «Сонечнае» ААТ «Белінвестбанк»:** вул. Маякоўскага, 16-а — з 9.00 да 13.00, з 14.00 да 15.00 (пятніца да 13.15). Выхадны — субота, нядзеля.

**Аддзяленне «Заводскае» ААТ Белінвестбанк»:** вул. Філатава, 12 — з 9.00 да 13.00, з 13.45 да 16.00 (пятніца да 15.00). Выхадны — субота, нядзеля.

## СТУДЭНЦКІ САЮЗ БДУ

Грамадскае аб'яднанне «Студэнцкі саюз БДУ» было заснавана ў красавіку 1997 г. з ініцыятывы студэнтаў. Мэта арганізацыі — дапамагчы моладзі раскрыць творчы патэнцыял, таленты і здольнасці, а таксама падтрымліваць і развіваць студэнцкае самакіраванне і традыцыі БДУ.

Пра ўсе важныя для Студсаюза БДУ навіны універсітэцкага і студэнцкага жыцця можна даведацца з газеты «Обратная СвязЬ». Карэспандэнтам газеты можа стаць кожны студэнт.

Для актыву прадугледжаны спецыяльныя заняткі па працы з грамадскасцю, штогод ладзіцца школа маладзёжнага актыву на базе РІВШ БДУ, а таксама выязныя семінары ва універсітэцкім спартыўна-аздараўленчым комплексе.

У чэрвені 2005 г. пры Студсаюзе быў створаны турыстычны клуб «Шлях». Будуць арганізоўвацца спартыўныя злёты, турыстычныя і экскурсійныя паездкі, спартыўныя спаборніцтвы і г.д.

Камітэт Студсаюза БДУ прымае ўдзел ва ўсіх агульнауніверсітэцкіх мерапрыемствах: Дні першакурсніка, Дні студэнта, балі выпускнікоў і інш. Студсаюз праводзіць і свае ўласныя святы.

У інтэрнатах працуе Служба студэнцкай бяспекі, створаная ў структуры Студсаюза. Яна спрыяе падтрыманню парадку на тэрыторыі студэнцкіх інтэрнатаў, а таксама дапамагае ў арганізацыі і правядзенні розных мерапрыемстваў.

Ствараюцца ўмовы для шырокіх міжнародных кантактаў. Студсаюз уваходзіць у Еўразійскую студэнцкую асацыяцыю (штаб-кватэра ў Маскве, у МДУ імя М.В. Ламаносава), якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў больш чым 60 універсітэтаў краін СНД.

**Старшыня студэнцкага саюза БДУ — Міхаіл СІМАНЮКОЎ.**

**Адрас: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 205, тэл. 205-52-61.**

**Фотаздымак Анастасіі ЮДЧЫЦ**

## АБ'ЯВЫ

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ",**

***факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў верасні-снежні 2005 г. выкладчыкаў і спецыялістаў БДУ:***

1. Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце ваенна-палітычнай гісторыі Беларусі (для выкладчыкаў) — вочная **(12.09—24.09);**

2. Пераемнасць у сістэме прыродазнаўчай адукацыі (для выкладчыкаў падрыхтоўчых факультэтаў ВНУ) — вочная **(12.09—24.09);**

3. Полікультурная адукацыя студэнцкай моладзі ў РБ (для спецыялістаў па міжнародных адносінах, сацыяльнай і выхаваўчай рабоце з моладдзю, цэнтраў студэнцкіх абменаў, выкладчыкаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін) — вочная **(12.09—16.09, 14.11—18.11);**

4. Выкарыстанне пакета "Microsoft Office 2000" у навучальным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу) — вочная **(12.09—18.11, 2 разы ў тыдзень);**

5. Арганізацыя выхаваўчай работы ў вышэйшай школе (для выхавальнікаў ВНУ) — вочная **(12.09—16.09, 05.12—09.12);**

6. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы: метадалогія і методыка выкладання (для выкладчыкаў) — вочная **(19.09—30.09);**

7. Беларуская эканамічная мадэль — кампанент ідэалогіі беларускай дзяржавы (для выкладчыкаў) — вочная **(19.09—01.10);**

ПЕРАПАДРЫХТОЎКА

8. Культуралогія (для выкладчыкаў) — вочная (з 12.09);

**Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 для папярэдняга запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220001, г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, 320, тэл./факс 200-25-51.**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

*Другі раунд перамоваў паміж прадстаўнікамі Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі і навукоўцамі БДУ наконт стварэння сумеснай лабараторыі адбыўся 2 верасня. Вынікам перамоваў стала падпісанне дагавора аб намерах. У бліжэйшай будучыні плануецца падпісанне кантракта на ўмовах поўнага фінансавання кітайскім бокам.*

# З Кітая ў БДУ. Па высокія тэхналогіі



Цікавасць спецыялістаў да распрацовак высокатэхналагічнай навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ сведчыць пра поспех інавацыйнага развіцця нашай навукі. Напрыклад, на сёння навукоўцы нашага універсітэта ў галіне хіміі маюць тэхналогіі, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні касмічнага комплекса «Буран». Эксперыментальна-вытворчыя лабараторыі універсітэта абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі і ствараюць цудоўныя магчымасці для рэалізацыі патэнцыялу нашых навукоўцаў.

Кітайская дэлегацыя наведала Беларусь, каб больш дэталёва вывучыць метады працы і магчымасці беларускага боку. Апрача запланаванага першага праекта вытворчасці супертрывалых высокатэхналагічных кляёў і высокатэмпературнай керамікі калегі з Хэйлунцзяна зацікавіліся і іншымі распрацоўкамі нашых навукоўцаў.

**Юлія ПІМЕНАВА**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# МАТЭМАТЫКІ НА П'ЕДЭСТАЛЕ

***Бліскучай перамогай студэнтаў БДУ скончылася XII Міжнародная студэнцкая алімпіяда па матэматыцы, якая адбылася ў ліпені ў Благоеградзе (Балгарыя). Усе ўдзельнікі каманды нашага ўніверсітэта атрымалі залатыя медалі. Абсалютнае першае месца ў асабістым заліку заваяваў Мікіта Селінгер. Гран-пры атрымалі Вікторыя Лебедзь і Сяргей Маркоўскі. Такога поспеху не мела ніводная каманда універсітэтаў свету за ўсю гісторыю алімпіяд.***



І названыя ўдзельнікі, і астатнія (Максім Жыховіч, Дзмітрый Дудко, Алена Пірутка) вучацца на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Трэніруе каманду дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі Ю.Б. Сыроід.

На ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання, што адбылася ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ, прысутнічалі міністр адукацыі А.М: Радзькоў, рэктар нашага універсітэта В.І. Стражаў, прарэктары і іншыя афіцыйныя асобы.

У такіх спаборніцтвах каманда матэматыкаў БДУ удзельнічала пяты раз. Апроч нашых матэматыкаў за перамогу змагаліся больш за 40 універсітэцкіх каманд з 29 краін: ЗША (Прынстан), Вялікабрытаніі (Оксфард, Манчэстэр), Германіі (Бон, Брэмен) і г.д.

На працягу двух дзён студэнты павінны былі рашыць 12 задач (кожны дзень па 6 задач за 5 гадзін). Кожная задача ацэньвалася ў 20 балаў. Заданні былі з такіх раздзелаў матэматыкі, як матэматычны аналіз, функцыянальны аналіз, тэорыя функцый комплекснай пераменнай, лінейная і абстрактная алгебры, геаметрыя, камбінаторыка.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**

## АСОБЫ

# ПАМЯЦЬ ПРА ВЫКЛАДЧЫЦУ

Уранні 10 жніўня 2005 г. у Маскве на 98-м годзе жыцця памерла **Ганна Натанаўна (Іаўнасаўна) НАХІМОЎСКАЯ** — адна з найстарэйшых супрацоўніц механіка-матэматычнага факультэта БДУ.

Яна нарадзілася ў Мінску 25 снежня 1907 г. У 1924 г. паступіла на фізіка-матэматычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ. Праз нейкі час пасля яго заканчэння, у 1932 г., яна была залічана на фізмат выкладчыцай. З таго часу яе жыццё было звязана з універсітэтам.

Вайну Г.Н. Нахімоўская сустрэла на пасадзе кіраўніцы таварыства грамадзянскай абароны: яго актывісты круглыя суткі дзяжурылі тады ва універсітэце. 26 чэрвеня, калі вораг ужо ўваходзіў у Мінск, калектыў БДУ атрымаў указанне адыходзіць на ўсход. Сышла і Нахімоўская. Пазней яна даведалася, што яе бацькі загінулі ў мінскім гета ў першыя месяцы акупацыі...

Г.Н. Нахімоўская апынулася ў Пензе: тут яна да 1943 г. выкладала ў педінстытуце. Адначасова працавала ў мясцовым шпіталі, бо скончыла курсы медсёстраў. Увосень 1943 г. прыехала ў Падмаскоўе, дзе на станцыі Сходня аднаўляў дзейнасць БДУ, а потым вярнулася і ў Мінск.

З 1947 па 1954 г. Г.Н. Нахімоўская ўзначальвала кафедру геаметрыі фізмата, потым працавала дацэнтам тамсама — аж да 1970 г. Зрэшты, выкладала яна і пазней, да сярэдзіны 80-х.

Сярод яе захапленняў былі такія, як любоў да паэзіі, заняткі альпінізмам. Удзельнічала яна і ў расшыфроўцы матэматычных рукапісаў К. Маркса.

Ганна Натанаўна пражыла доўгае жыццё, але не мела сям'і. Аднак яе памятаюць вучні, а таксама ведаюць вучні вучняў. Памяць пра яе непарыўна звязаная з гісторыяй БДУ.

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# Першыя крокі да вышэйшай адукацыі

*Урачысты сход, прысвечаны выпуску нігерыйскіх слухачоў, якія навучаліся на факультэце дауніверсітэцкай адукацыі, адбыўся 31 жніўня.*

На ўрачыстым сходзе з прывітальным словам выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце У.Л. Клюня. На свята прыйшлі і прадстаўнікі пасольства Нігерыі. Дэкан В.М. Малафееў і выкладчыкі ФДА сказалі замежным выпускнікам цёплыя словы, падзякавалі ім за старанасць і працавітасць.

Дагавор паміж БДУ і нігерыйскім штатам Баэлса аб прыёме і навучанні ў нашым універсітэце нігерыйскіх грамадзянаў быў падпісаны ў жніўні 2004 г. За год на факультэце дауніверсітэцкай адукацыі прайшлі навучанне 56 слухачоў: на эканамічным профілі — 2, на прыродазнаўчым — 4, на тэхнічным — 15, на медыка-біялагічным — 28, на сельскагаспадарчым — 7. Выпускныя іспыты на «выдатна» і «добра» здалі 68 % (прычым 6 слухачоў атрымалі толькі «выдатна», а 32 — «выдатна» і «добра»).

За час навучання нігерыйскія слухачы не толькі актыўна асвойвалі веды, але і прымалі ўдзел у грамадскім жыцці і культурна-масавых мерапрыемствах горада, універсітэта, факультэта. На штогадовым конкурсе таварыства замежных студэнтаў Мінска «F-ART.by» яны сталі лаўрэатамі конкурсаў мастацкай самадзейнасці, нацыянальнай кухні, нацыянальнага касцюма. На універсітэцкім конкурсе мастацкай самадзейнасці тры нігерыйскія калектывы сталі лаўрэатамі і ўдзельнічалі ў заключным гала-канцэрце. За сваю актыўнасць амаль усе выпускнікі атрымалі ганаровыя граматы. Двое з 56 выпускнікоў атрымалі нават па 5 ганаровых грамат.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся выпускны вечар. Студэнты спявалі песні не толькі на роднай мове, але і на рускай і беларускай. Чыталі вершы, некаторыя з якіх самі ж і напісалі.

Цяпер яны пераватарыліся ў абітурыентаў, а неўзабаве стануць студэнтамі БДУ ці іншых беларускіх ВНУ. Але яны заўсёды будуць памятаць, дзе рабілі свае першыя крокі для атрымання вышэйшай адукацыі.

**Юлія ПАПОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

8 верасня 2005 года
Падпісана да друку 07.09.2005 г.
Зак.724. Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ".
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by